**УДК 94(476)**

# ШЛЮБЫ Ў ШЛЯХЕЦКІМ САСЛОЎІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ

***С.У. СЛОВІК***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*Даследуецца практыка заключэння шлюбаў набілітэту першай паловы XIX стагоддзя на падставе аналізу архіўных матэрыялаў па Гродзенскай губерні, прававых дакументаў, мемуарнай літаратуры XIX стагоддзя і інш. Апісваецца працэдура заключэння шлюбаў згодна з кананічна-прававымі і абычаёвымі пастулатамі шляхецкага саслоўя з улікам змен у сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. На падставе аналізу гістарычных крыніц робіцца вынік, што царкоўны шлюб з дазволу бацькоў тут быў адзінай прынятай формай рэгулявання будучага сумеснага жыцця маладых, меў месца прыярытэт каталіцкай канфесіі ў шлюбнай практыцы, а згодна з тагачасным заканадаўствам дадзеная працэдура ўскладнялася. Аўтар адзначае характэрныя працэсы дэтэрмінацыі бацькоўскай волі пры выбары сужонкаў для сваіх дзяцей і нязначныя змены ў бок больш талерантнай палітыкі сям'і ў практыцы заключэння шлюбаў.*

**Уводзіны.** Арганізацыя сям'і ў шляхецкім саслоўі выступала як дадзенасць, якая існуе і эвалюцыянуе разам са стэрэатыпамі ў тагачасным грамадстве. На працягу стагоддзяў вызначаліся мэты, складваліся традыцыі ўнутрысямейных зносінаў, умовы, прынцыпы і практыка арганізацыі новай сям'і, нормы яе функцыянавання ў грамадстве, на якія паўплывалі сацыяльна-палітычныя і культурныя змены гістарычных эпох. Можна казаць, што толькі напрыканцы XVI стагоддзя сям'я набілітэту беларускіх зямель пачала фарміравацца праз заканадаўства. Законы Статута Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзя па рэгуляванню сямейна-шлюбных аносінаў адлюстравалі асноўныя рысы новай сістэмы права згодна еўрапейскай юрыспрудэнцыі [1, с. 230]. У выніку кадыфікацыі права ў Статуце ВКЛ вызначылася індывідуалізацыя прававых зносін, знікла калектыўная прававая адказнасць сям'і, з'явілася тэндэнцыя да канкрэтызацыі і гарантавання правоў кожнага яе члена. У законе падкрэслівалася каштоўнасць сям'і, шлюбу, прававое афармленне атрымалі маёмасныя і асабістыя правы сямейнікаў. Такім чынам, сям'я станавілася асноўнай групай грамадства, якая ўтваралася ў момант шлюбу, мужчына і жанчына ў супольным жыцці працягвалі род, вялі агульную хатнюю гаспадарку. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай напрыканцы XVIII стагоддзя і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі прававое і эканамічнае становішча шляхецкага саслоўя змянілася, што, на наш погляд, значна паўплывала на практыку і працэдуру заключэння шлюбаў у шляхецкім саслоўі.

Задачамі данай працы з'яўляюцца даследаванне практыкі і апісанне працэдуры заключэння шлюбаў у шляхецкім саслоўі ў першай палове XIX стагоддзя на фоне палітычна-эканамічных і сацыяльных змен, вызначэнне шлюбнага ўзросту будучых сужонкаў і іх канфесійнай прыналежнасці.

**Асноўная частка.** Сям'я і шлюб у разумені тагачаснага шляхецкага саслоўя – гэта саюз мужчыны і жанчыны, якія ў супольным жыцці падаўжалі шляхецкі род, вялі агульную гаспадарку. Увядзенне абавязковай царкоўнай рэгістрацыі шлюбу на беларускіх землях датуецца другой паловай XVI стагоддзя, калі шляхта Рэчы Паспалітай прызнала адпаведныя пастановы Трыдзенскага сабору (1577 г.) [1, с. 239]. У першай палове XIX стагоддзя стварэнне новай сям'і ў шляхецкім асяродку таксама ажыццяўлялася праз касцельны шлюб – канчатковую форму замужжа, мела дзве формы абычаёвай і праўнай практыкі:

1) афіцыйная – вусная заява маладых святару царквы аб сваім жаданні ўзяць шлюб, яе публічнае аглашэнне ў царкве і непасрэднае заключэнне касцельнага шлюбу;

2) фармальная – адвездзіны бацькоў, блізкіх і родных "фаміліі", змовіны, якія мелі свецкі характар.

Акрамя абавязковага цывільнага кодэксу Статута ВКЛ 1588 года і "Свода законов Российской империи" шлюбныя справы знаходзіліся ў кампетэнцыі духоўных судоў 4-х галоўных хрысціянскіх веравызнанняў: рыма-каталіцкага, грэка-каталіцкага, праваслаўнага і пратэстанцкага. Рэгуляваліся кананічна-прававымі нормамі: ўзроставым цэнзам, саслоўным становішчам і канфесіянальнай прыналежнасцю. Згодна з юрыдычным правам Расійскай імперыі, якое было распаўсюджана на далучаныя тэрыторыі, шлюбны ўзрост надыходзіў у жанчын у 16 гадоў, мужчын – у 18, ніжняя мяжа дазволу заключэння шлюбу – 80 гадоў [2, с. 10]. Гэтае права абавязвала асобаў, якія збіраліся заключыць шлюб, паведамляць аб ім не толькі бацькам, але і святару аднаго з прыходаў будучых сужонкаў у прыстунасці двух ці трох свед-каў. У сваю чаргу, святар павінен быў агласіць намер у царкве і распачаць працэдуру так званага "вобыску", які заключаўся ў пошуку інфармацыі аб тых ці іншых перашкодах да рэгістрацыі шлюбу [2, с. 13]. Знойдзеныя дадзеныя святар апрацоўваў па загаданай структуры і фіксаваў у спецыяльнай кнізе, якую

выдавала Кансісторыя ці Духоўнае праўленне. Гэтыя кнігі захоўваліся ў царкве разам з метрычнымі. Галоўным доказам заключанага шлюбу былі запісы адпаведнай працэдуры ў царкоўных метрычных кнігах. Важкім доказам шлюбу служылі кнігі "вобыску" і "спавядальныя", паказанні пад прысягаю святара царквы і сведкаў аб рэгістрацыі шлюбу [2, с. 27].

Па кананічнаму праву шлюб лічыўся несапраўдным, калі ўзнікалі парушэнні. Да іх адносіліся наступныя звесткі аб адбыўшымся працэсе:

1) без дазволу бацькоў, апекуноў і інш.;
2) пад прымусам бацькоў, апекуноў;
3) выкраданне дачкі для ўзяцця шлюбу, што лічылася злачынствам;
4) узяцце чацвертага шлюбу;
5) узяцце новага шлюбу пры існуючым;
6) узяцце шлюбу паміж кроўнымі (па лініі маці) [2, с. 29].

Вышэйпералічаныя абмежаванні з'яўляліся абавязковымі нормамі. Аднак былі выпадкі, калі незаконныя шлюбы мелі месца ў практыцы стварэння новай сям'і. Архіўныя дадзеныя сведчаць, што сярод шляхецкага саслоўя сустракалася паддвойнае сужонства. Так, Віленская рыма-каталіцкая Кансісторыя забараніла шляхцічу Шалевічу жыць з другой жонкай, бо ён меў законную першую жонку; суд скасаваў другі шлюб, а Шалевіч быў адслежаны касцельнымі ўладамі [3, с. 1]. У некаторых выпадках самі святары, ведаючы аб падмане, па тых ці іншых прычынах рэгістравалі шлюбы. У Брэсцкім павеце, напрыклад, быў пададзены ў пошук святар, які павянчаў жанчыну, якая была ўжо замужам [4, с. 1]. У Мастах Гродзенскай губерніі святар А. Палітоўскі пашлюбіў 13-цігадовага хлопчыка, што пазней прывяло да скасавання шлюбу ўладамі [5, с. 4].

Аналіз шэрагу крыніц дазваляе казаць, што ў пачатку XIX стагоддзя па-ранейшаму назіралася дэтэрмінацыя бацькоўскай волі ў выбары будучага сужонка ці сужонкі. Гэта часта вяло да таго, што шлюбы не былі гарманічнымі: адсутнічала каханне і пачуцці, вялікая розніца ў гадах паміж сужонкамі па-рознаму адбівалася на іх сямейным жыцці. Мемуарная літаратура XIX стагоддзя найбольш яскрава адлюстроўвае эмацыйны і пачуццёвы бок гэткага шлюбу: "Пан А. Ржэвускі мае 40 гадоў. Ажаніўся ў 18 гадоў з пані Жэрабскай, старэйшай за яго. На працягу 6 гадоў сям'я жыла добра. Цяпер Ржэвускі карыстае з сваёй маладосці, а пані жыве ў вёсцы і пагадзілася на паводзіны мужа. Пані з мужам баіцца паказвацца, каб не прынялі яе за яго маці. Муж калі-некалі заязджае ў госці да жонцы" [6, с. 69]. Мемуарыст таго часу Станіслаў Мараўскі ў сваіх успамінах іранічна разважае: "Жонка нашага Кастуся прынесла яму маладосць, вялікі маёнтак, прыгажосць. Што ён даў ёй: знуджаную душу, знішчаныя фізічныя сілы, глухату і лысіну? Прызнай, што гандаль карысны не ў два бакі" [7, с. 123]. Маладыя асобы пэўным чынам пратэставалі супраць ігнаравання іх волі пры заключэнні шлюбаў, што іншы раз абарачвалася драматычнымі сітуацыямі ў сям'і, нават разрывам зносінаў паміж бацькамі і дзецьмі. "Дачка Зосі і Рамуальда закахалася і ўцякла з каханкам у Прусію ад бацькі. Рамуальд не прымаў ад яе лістоў і захаваў крыўду на дачку" [8, с. 17]. Пісьменніца XIX стагоддзя Эва Фелінская піша, што нярэдка маладая паненка вярталася з рэдутаў ужо павенчаная, праз сведкаў – звычайна блізкіх давераных ёй людзей – паведамляла родным аб сваім замужнім стане [9, с. 349].

Гэткія прыклады мелі месца пры стварэнні новай сям'і ў першай палове XIX стагоддзя, але іх трэба аднесці больш да выключэнняў, чым да нормы. Практыка, калі дзеці самастойна вырашалі шлюбныя адносіны, па сутнасці, супярэчыла "адвечнаму шляхецкаму этыкету", яна прывяла ў другой палове XIX стагоддзя да актыўных дыскусій у грамадстве па пытанню "этычнасці шлюбаў і маральнай каштоўнасці сужонства, дзе пануюць абаюдныя згода і каханне" [10, с. 12]. Шляхецкае саслоўе адстойвала традыцыйную арганізацыі сям'і, але пастунова пачало ўлічваць пачуцці сваіх дзяцей. Прыкладна ў 40 – 50-х гадах XIX стагоддзя бацькоўская воля, застаючыся важкай у сферы выбару сужонкаў, стала больш лагоднай і не такой выключнай [11, с. 120]. Такім чынам, кананічна-прававыя нормы трансфармаваліся, але працягвалі рэгуляваць адносіны паміж бацькамі і дзецьмі.

**Шлюбны ўзрост.** Даследаванне практыкі заключэння шлюбаў набілітэту было б няпоўным без аналізу ўзросту будучых сужонка і сужонкі. Праведзеныя аўтарам даследаванні метрычных кніг Гродзенскай губерні [12] дазваляюць мець ураженне аб тым, у якім узросце найчасцей выходзілі замуж ці жаніліся маладыя шляхецкага саслоўяў першай паловы XIX стагоддзя. З агульнай колькасці – 569 пар – 42 % жанчын бралі шлюб ва ўзросце з 16 да 20 гадоў. Амаль удвая скарачаюцца шлюбы жанчын 21 – 25 гадоў, але паказчык іх застаецца высокім (28 %). Мужчынская палова шляхецкага саслоўя магла ствараць сям'ю пачынаючы з 18 гадоў, але выпадкі заключэння ранніх шлюбаў з іх боку – рэдкая з'ява, агульны працэнт шлюбаў мужчын ад 18 да 20 гадоў – 4 %. Актыўны ўзрост мужчын пры арганізацыі новай сям'і пачынаецца з 20 гадоў. Ва ўзросце 21 – 25 гадоў сярод мужчын адбываецца рэзкае павелічэнне колькасці заключаных шлюбаў, амаль у 10 разоў, і складае 32 %. Да 30 гадоў мужчыны актыўна вялі справу арганізацыі

свайго будучага жыцця, іх шлюбны ўзрост у 26 – 30 гадоў складае 27 % з даследаваных. А вось для жанчын гэта ўжо ўзрост, калі колькасць шлюбаў зніжаецца, складае толькі 17 %. Шлюб жанчыны пасля 30-ці гадоў – справа выключная, толькі 6 %. Для мужчын акрэсленны ўзрост яшчэ актыўны і складае 15 %. Толькі 1 % жанчын уступілі ў шлюб пасля 40 гадоў, а для мужчын гэты ўзрост быў хоць і не самым актыўным, але паўнавартасным – 12 % (табл. 1).

Табліца 1

Вынікі даследавання практыкі заключэння шлюбаў – шлюбны ўзрост

| Усяго 569 пар | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| Узрост (у гадах) | 1820 – 1860 гады | % | 1820 – 1860 гады | % |
| 16 да 20 | 24 | 4 | 239 | 42 |
| 21 – 25 | 183 | 32 | 162 | 28 |
| 26 – 30 | 153 | 27 | 95 | 17 |
| 31 – 35 | 86 | 15 | 33 | 6 |
| 36 – 40 | 58 | 10 | 35 | 6 |
| вышэй за 40 | 65 | 12 | 5 | 1 |

Раннія шлюбы ў асяроддзі шляхецкага саслоўя нельга лічыць распаўсюджанай з’явай XIX стагоддзя. Гэтую думку пацвярджаюць успаміны Э. Фелінскай: “Цяпер не прынята было аддаваць рана замуж. Бацькі імкнуліся да выхавання сваіх дачок, хацелі ім даць пэўную адукацыю” [9, с. 320]. У першай палове XIX стагоддзя яшчэ заставалася феадальная традыцыя злоўжывання бацькоўскай воляй, у большай ступенні адносна дочак, чым сыноў. Дачок выдавалі замуж тады, калі гэта было выгадна для сям’і. “Бацька паведаміў, што жаніх – чалавек учцівы, мае фундуш, рэпутацыю... Лёс Эўкі быў вырашаны” [9, с. 380]. Маладых паненак шляхецкая сям’я імкнулася хутчэй выдаць замуж, бо яны мелі абмежаваныя поле сустрэч і права выбару партнёра для жыцця. Іх заняткі, сустрэчы і выбар будучага сужонка строга кантраляваліся бацькамі. Мужчыны былі больш незалежнымі і вольнымі пры прыняцці асабістага рашэння. Іх жаданне аб стварэнні будучай сям’і прыпадала на больш позні ўзроставы перыяд, што было абумоўлена як эканамічнымі, так і юрыдычнымі фактарамі. На момант пошуку сужонкі яны былі ўжо дарослымі людзьмі, мелі вопыт жыцця і сексуальных зносін: “Брат Лявон ахвотна расказваў мне аб вольных паводзінах сваіх старэйшых братоў. За іх грахі плаціў пашкоджаным сялянскім дзяўчатам бацька…” [13, с. 57]. Жаніхі шлюбнага ўзросту звычайна добра “ведалі свет”, мелі грошы, знаходзілі час для ўпарадкавання і рэгулявання свайго прыватнага жыцця: “Мой прыяцель шукае сабе жонку і мае ўсе патрэбныя якасці – найлепшыя прыкметы – сувязі, значны маёнтак, з’яўляецца добрым гаспадаром, вялікім аматарам парадку, непрыяцелем прэтэнзіі” [14, с. 58].

**Канфесійная прыналежнасць сужонкаў.** Асабістую ролю пры заключэнні шлюбаў выконвала рэлігійная прыналежнасць сужонкаў да той ці іншай царквы. Шлюбы паміж каталікамі не мелі перашкодаў як з боку святароў, так і прававых нормаў. А вось шлюбы паміж каталікамі, уніятамі, праваслаўнымі ці прадстаўнікамі іншага веравызнання былі абмежаваныя шматлікімі ўказамі і прадпісаннямі. Гэта ўскладняла як магчымасць выбару сужонкаў, так і працэдуру шлюбу. У главе 2 закона Расійскай імперыі “О браках лиц других Христианских исповеданий между собой с лицами Грекоросийской веры” указваецца на неабходнасць у выпадку шлюбу католіка з праваслаўным прысутнасці шэрагу асобаў супрацьлеглай веры (каталіцкай), якія складалі пісьмовую заяву аб тым, што не будуць чыніць перашкод супраць праваслаўных традыцый у будучай сям’і [1, с. 54]. Шлюбы заключаліся святаром той царквы, да якой належала нявеста. Пры адсутнасці згоды рыма-каталіцкага святара заключаць такі шлюб вянчанне мог здзейсніць святар праваслаўнай царквы. Калі нявеста была “грэка-расійскай веры”, а шлюб заключыў святар каталіцкай царквы, гэткая працэдура ў межах Расійскай імперыі і на тэрыторыі “возвращенных от Польши губерний…” лічылася несапраўднай [1, с. 58]. Незаконнымі прызнаваліся таксама шлюбы паміж вернікамі хрысціянскага і нехрысціянскага веравызнання [1, с. 66]. Архіўныя матэрыялы пацвярджаюць такія абмежаванні. У 1839 годзе паненка Камінская падае прашэнне аб уступленні ў шлюб па праваслаўнаму абраду, але сама паходзіла ад змешанага шлюбу. Яе бацька – былы ўніят, зараз праваслаўны, маці – каталічка, адпаведна і яна выхоўвалася і была ахрышчаная па каталіцкаму абраду. Кіруючыся ўказам ад 1832 годзе, дзе адначаецца, што асобу мужчынскага полу трэба выхоўваюць ў веры бацькі, жаночага – у веры маці, павятовы іспраўнік не даў дазвол на рэгістрацыю шлюбу Камінскай па праваслаўнаму абраду [15, с. 1].

На падставе архіўных матэрыялаў намі быў праведзены аналіз канфесійнай прыналежнасці будучых сужонкаў у Гродзенскай губерні [18]. Даследаванні сведчаць, што істотную ролю пры выбары сужонкаў шляхты адыгрывала рэлігійная прыналежнасць да каталіцай веры. На думку польскага даследчыка

А. Заянчкоўскага, у першай палове XIX стагоддзя каталіцкая рэлігійная традыцыя была непарыўна злучаная з шляхецтвам, утварала адзін лёс. Шляхта лічыла, што Бог стварыў шляхецтва, але гэты Бог каталіцкі, паміж ім і шляхецтвам нават існавала дамова [16, с. 54]. Навуковыя даследаванні беларускіх гісторыкаў сведчаць, што на беларускіх землях на мяжы XVIII – XIX стагоддзяў у асяроддзі вышэйшага саслоўя каталікі складалі каля 87 %, праваслаўныя – 6 %, уніяты – 5,4 % [17, с. 9]. Зроблены аналіз канфесійнай прыналежнасці будучых сужонкаў дазваляе сцвярджаць, што на 280 шляхецкіх пар прыпадае 92 % шлюбаў паміж католікамі і толькі 8 % – каталіцкай і іншай рэлігіі (табл. 2) [18]. Каталіцкая рэлігія дамінуе і з'яўляецца прыарытэтнай у практыцы заключэння шлюбаў у першай палове XIX стагоддзя для шляхецкага саслоўя.

Табліца 2

Шлюбы адносна канфесіі ў шляхецкім саслоўі

| Усяго | Католік/католік | | Грэка-ўніят/католік | | Евангеліст/католік | | Праваслаўны/католік | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| пары | пары | % | пары | % | пары | % | пары | % |
| 280 | 256 | 92 | 12 | 4 | 5 | 2 | 7 | 2 |

**Заключэнне.** Даследаваная практыка працэдуры заключэння шлюбаў у шляхецкім саслоўі першай паловы XIX стагоддзя ў Гродзенская губерні дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1) практыка і працэдура заключэння шлюбаў набілітэта строга рэгулявалася кананічна-прававаымі і абычаёвымі пастулатамі. Увядзенне заканадаўства Расійскай імперыі на гродзенскіх землях ускладніла дадзены працэс для шляхецага саслоўя шэрагам прадпісанняў і пастаноў, якія тычыліся ў асноўным канфесійнай прыналежнасці. Царкоўны шлюб з благаславення бацькоў быў адзінай традыцыйнай формай рэгулявання сумеснага жыцця. Іншыя формы заключэння шлюбу сустракалі перашкоды як з боку касцельных і свецкіх інстытутаў, так і з боку грамадскай думкі, самой шляхецкай "фаміліі";

2) змены ў эканамічна-сацыяльным становішчы, у якім апынулся шляхта першай паловы XIX стагоддзя, дэкласацыя набілітэту, страта маёнткаў, зніжэнне матэрыяльнага ўзроўню жыцця шляхецкіх сямей спрыялі таму, што раннія шлюбы як для мужчын, так і для жанчын сталі нехарактэрнай з'явай;

3) асноўную і неаспрэчную ролю ў шлюбнай практыцы першай паловы XIX стагоддзя на гродзенскіх землях працягвала адыгрываць прыналежнасць да каталіцкай канфесіі. Рэлігія з'яўлялася прыарытэтнай і акрэслівала практыку сужонства, прынцыпы якой павінны былі супадаць з галоўнымі свецкімі мэтамі жыцця сям'і, калі апошняя хацела мець прызнанне ў грамадстве. Абмежаванні ўтваралі кананічна-прававыя пастулаты, а таксама палітыка, якую праводзіла сям'япа селекцыі партнёраў; перадолець іх было цяжка, пэўныя бар'еры існавалі як юрыдычныя і фармальныя перашкоды;

4) прыкладна ў 1840 – 1850-х гадах бацькоўская воля, застаючыся значнай у сферы выбару партнёраў для сваіх дзяцей, паступова стала больш лагоднай і не такой выключнай. На наш погляд, гэта прывяло да больш талерантнай палітыкі ў практыцы заключэння шлюбаў, бацькі пачалі ўлічваць пачуцці і жаданні сваіх дзяцей;

5) нягледзячы на палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя змены, у даследуемы час назіралася пэўная ідэалізацыя даўнейшых шляхецкіх традыцый, прадстаўнікі вышэйшага саслоўя схіляліся да захавання "шляхецкага стылю жыцця", а ў крытычныя часы – да яго адраджэння праз формы шлюбнай практыкі. Такім чынам, сям'я набілітэту першай паловы XIX стагоддзя працягвала замыкацца ва ўласным коле.

ЛІТАРАТУРА


1. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. – М.: "Юрид. лит.", 1980. – 559 с.
2. Свод законов Российской империи. Ч. 1. 1835. – СПб., 1835. – Гл. 1.
3. О незаконном браке помещика Шалевича // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусіў, г. Гродна (далей – НГАБ, г. Гродна). – Фонд 2. – Воп. 2. – Спр. 413. – 3 л.
4. О заключении незаконного брака священником Кунцевичем // НГАБ, г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 1750. – 2 л.
5. О незаконном браке, совершенном священником Политовским // НГАБ, г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 7. – Спр. 1022. – 5 л.
6. Jezierska, W. Z życia dworów i zamków na Kresach 1828 – 1844 / W. Jezierska. – W-wa, 1924. – 70 s.
7. Morawski, St. Z wiejskiej samotni / St. Morawski. – Warszawa, 1981. – 195 s

8. Chodzko, Ig. Obrazy Litewskie / Ig. Chodzko. – 3 Wyd. – Wilno, 1872. – Serya 4. – 250 s.
9. Felinska E. Pamiętniki z życia / E. Felinska. – Wilno, 1856. – T. 1. – 467 s.
10. Gozdziewicz, J. Kwiestyakobiecazestanowiskaspoleczno-etycznego / J. Gozdziewicz. – Poznan, 1904. – 20 s.
11. Bystron, J.St. Dzieje obyczajow w dawnej Polsce wiek XVI – XVIII / J.St. Bystron. – Warszawa, 1994. – T. 11. – 292 s.
12. Ksiega metryk Szlubnych 1827 / 1832 гг. // НГАБ, г. Гродна. – Фонд 259. – Воп. 1. – Спр. 21; Книга Индурского косцела о браке за 1848 / 78 гг. – Фонд 261. – Воп. 2. – Спр. 3. Книга регистрации предбрачных дознаний за 1835 / 38 гг. – Фонд 259. – Воп. 2. – Спр. 1; Книга записи предбрачных опросов и дознаний за 1863/64 гг. – Фонд 259. – Воп. 2. – Спр. 63.; О бракосочитании Грод. Уезда Грод. Губернии Виленской консистории. Индура 1847 / 1848 г. – Фонд 261. – Воп. 1. – Спр. 13.
13. Dyszlewska, H. Dziekresowejrodzinyziemianskej. PowstancySybiracy, Akowcy, Emigranci / H. Dyszlewska. – W-wa, 1996. – 225 s.
14. Bujnicki, K. Wendrowkapomalychdrogach.Szkiceobyczajownaprawincji / K. Bujnicki. – Wilno, 1841. – T. 1 – 2. – 146 s.
15. Прошение шлехтянки Каминской вступить в брак по католическому обряду // НГАБ, г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 1566.
16. Zajaczkowski, An. Szlachta polska. Kultura i struktura / An. Zajaczkowski. – Warszawa, 1993. – 172 s.
17. Люты, А.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму: Канец XVIII – першая палова XIX ст.: вучэб. дапам. / А.М. Люты, Г.М. Туміловіч. – Мінск, 1991. – 16 с.
18. Книга Индурского косцела о браке за 1848 / 78 гг. // НГАБ, г. Гродна. – Фонд261. – Воп. 2.– Спр. 3; Книга записи предбрачных опросов и дознаний за 1863 / 64 гг. Фонд 259. – Воп. 2 – Спр. 63; Книга записи предбрачных опросов и дознаний за 1847 – 1854 гг. – Фонд 259. – Воп. 2. – Спр. 39.

*Пастуniў 06.04.2013*

## MARRIAGE CONTRACT IN GENTRY ESTATE IN BELARUS AT THE BEGINNING OF THE XIX$^{TH}$ CENTURY

***S. SLOVIK***

*Marriage contract in gentry families in Belarus at the beginning of the XIX$^{th}$ century on the basis of the analysis of archive materials, legal documents, memoirs of the XIX$^{th}$ century etc. is studied. Marriage contract procedure according to canonical, legal and custom postulates of gentry estate taking into consideration political, social and economical changes after the entry of Belarusian territories into the Russian empire is described. The author summarizes that religious marriage with parental permission was the only accepted form of future conjoint life regulation as well as catholic confession took priority in marriage contract procedure. The author mentions characteristic processes of determination of parental will when choosing spouses for their children and insignificant changes towards a more tolerant policy of a family in practice of marriage.*